# ВЕРАСНЁЎСКІ ЗААІК

Верасень... Ён зноў і зноў то пажоўклым лісцем, то бялесымі павуцінкамі напамінае, што прыйшла да нас чараўніца-восень. Але нідзе так не адчуваецца набліжэнне гэтай пары года, як на сяле: адцягваюць да долу галінкі налітыя пераспелыя яблыкі, усе часцей і часцей чуецца над парыжэлым ржышчам развітальная песня жураўоў.

Восень—вельмі адказны, напружаны час менавіта для працаўнікоў вёскі. Трэба своечасова, як мага хутчэй убраць яе дары, бо восень не песціць добрым надвор'ем.

І хоць нашы калгасы і саўгасы маюць шмат тэхнікі, аднак хлебаробам без дапамогі студэнтаў абыйсціся цяжка. Яно і не дзіўна: адразу паспявае столькі работ! Студэнты нашага універсітэта здаўна сябруюць з працаўнікамі палёў Міншчыны.

Сёлета яны працуюць у Бярэзінскім, Дзяржынскім і Уздзенскім раёнах. Нядаўна намеснік сакратара парткома універсітэта Р. А. Малюковіч, намеснікі дэканаў хімічнага і матэматычнага факультэтаў В. Ф. Цікавы, І. А. Паўлаў, супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» выехалі ў Дзяржынскі раён. Цікава было даведацца, як сустрэлі калгаснікі студэнтаў, і галоўнае — як арганізаваны праца і адпачынак нашых юнакоў і дзяўчат.

*ПРАБЛЕМА ЗАСТАЛАСЯ НЯВЫРАШАНАЙ*

Спачатку мы накіраваліся ў калгас «Непераможны сцяг». Менавіта адсюль паступіў трывожны сігнал. Кіраўнікі гаспадаркі паведамілі ў партком, што студэнты-матэматыкі дрэнна працуюць. І вось мы гутарым са старшынёй.

— Справа ў тым, што працаваць яны не хочуць, нормы не выконваюць...

Сапраўды, як вынікае з папер, пры плане 480 кожны студэнт накопвае ў сярэднім па... 380 кілаграмаў бульбы, і гэта пры добрай ураджайнасці і спрыяльным надвор'і.

— Хацеў я высветліць, колькі можа накапаць за дзень кожны. Можа норму варта памяняць?.. Прапанаваў працаваць па талонах. Высыпаў вядро бульбы — атрымлівай талон. Катэгарычна адмовіліся, — абураўся старшыня. — На кожнага чалавека калгас выдзяляе прадуктаў на 1 рубель 16 капеек, а не зарабляюць яны і рубля...

Усе разам ідзем у поле. Яшчэ здалёк відаць, што працуюць студэнты старанна, разам з імі іх кіраўнік А. С. Моткін. З размовы высветлілася, што ў поле яны выходзяць рана, вяртаюцца прыцемкам. Пасля абеду таксама спяшаюцца хутчэй прыступіць да работы. А па талонах працаваць не хочуць: лічаць, што карысці ад гэтага ніякай няма. Ім зручней разам, гуртам. Адны капаюць, другія вёдры з клубнямі носяць.

— Чаму норма не выконваецца? — гаворыць А. С. Моткін. — А вы паглядзіце, як арганізавана наша праца. Бульбянішча не скошана. Прыйдзем на работу—і вунь колькі чакаем, пакуль баразны разгоняць...

Вось такімі былі думкі абодвух бакоў. Паслухаеш—і здаецца, што кожны з іх мае рацыю. Прэтэнзіі былі ўважліва выслуханы прадстаўнікамі дэканатаў і парткома. Выслуханы — і толькі. Нічога канкрэтнага на месцы не было вырашана: вельмі спяшаліся, і не хапіла на гэта часу.

*— А ЯК СПРАВЫ У ХІМІКАЎ? —*

запыталіся мы ў студэнтаў хімічнага факультэта. Другакурсніцы Ларыса Крыжанкова, Наташа Старавойтава, Надзя Кашчэева, Люда Карпава і іншыя дзяўчаты расказалі, што ў калгасе «Кастрычніцкая рэвалюцыя» іх 75. Па 10—12 чалавек працуюць у розных брыгадах. Сустрэлі калгаснікі іх вельмі добра. Загадзя былі падрыхтаваны кватэры, закуплены неабходныя прадукты. Ну, і студэнты стараюцца апраўдаць давер'е. Працуюць многа і старанна. За дзень паспяваюць выканаць па паўтары, а то і па дзве нормы. Хоць з поля вяртаюцца стомленыя, але пасля смачнай вячэры колькі сіл і энергіі прыбаўляецца! Вольнага часу не вельмі многа, а усё ж яны паспяваюць схадзіць у кіно, пачытаць — у калгасе ёсць добрая бібліятэка. Хутка студэнты выступяць перад калгаснікамі з канцэртам мастацкай самадзейнасці.

Пабывалі мы яшчэ ў некалькіх гаспадарках Дзяржынскага раёна. Як высветлілася, справы там увогуле ідуць нядрэнна. Усюды нашы юнакі і дзяўчаты сустракаюць прыхільнасць і клопат калгаснікаў. І на гэта яны адказваюць старанняй працай, добрымі паводзінамі і вясёлымі песнямі, якія так любяць слухаць мясцовыя жыхары.

Але здараюцца часам выпадкі парушэння працоўнай дысцыпліны, норм паводзін, што і выклікае нараканні.

Спадзяемся, што кіраўнікі гаспадарак разам з супрацоўнікамі універсітэта, якія нясуць адказнасць за работу студэнтаў на сяле, будуць своечасова выяўляць недахопы і ўхіляць іх.

**А. АЛЕКСАНДРОВІЧ,**
**спец. кар.**





*НА ЗДЫМКАХ:*
● *(уверсе) Анатоль Мішкарудны і Мікалай Сцепанюк адчуваюць сябе гаспадарамі на зернетаку;*
● *Ігар Румянцаў — «механізатар». адказны за транспарціроўку бульбы;*
● *(справа) за сталом— як у полі;*
● *(на 3-й стар.): бульбіна—за бульбінай, вядро—за вядром.*
*Фота Д. Чаховіча.*





*ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ*

## Не выходзяць з парадку дня

Марыя Папкова, студэнтка 3 курса факультэта журналістыкі, прыйшла ў прафком радасная, узбуджаная, з загарэлым тварам. Яе настрой гаварыў аб тым, што адпачынак свой яна правяла добра.

— Дзякую. Ніколі не думала, што так можна падмацаваць здароўе. А колькі пабачыла! Успамінаў не на адзін год, — расказвала яна, кладучы на стол карашок ад санаторнай пуцёўкі.

А я ўспамінаю. Экзамены вясной Марыя здала добра. Толькі са здароўем было не ўсё ў парадку. Члены факультэцкага прафбюро параілі ёй падаць заяву ў прафком на атрыманне пуцёўкі.

У той час заяў на такія пуцёўкі было нямала. Толькі за лета падмацавалі сваё здароўе ў санаторыях краіны 25 студэнтаў універсітэта, больш за 70 пабывалі ў дамах адпачынку.

Добрае ўражанне аб летніх канікулах засталося і ў тых, хто праводзіў лета ў нашым спартыўна - аздараўленчым лагеры на возеры Нарач.

Няма сумнення, што умела арганізаваны адпачынак становуча ўплывае на паспяховасць. Таму прафсаюзны камітэт універсітэта, факультэцкія прафсаюзныя арганізацыі звяртаюць на гэта асаблівую ўвагу. Хутка пачнуцца заняткі, але пытанне адпачынку студэнтаў не выходзіць з парадку дня. Зноў кожны дзень ля універсітэта будзе спыняцца аўтобус з кірункам у прафілакторый ВНУ. 13 пуцёвак у санаторыі і 16 у дамы адпачынку атрымае прафком ад абласнога камітэта прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навучальных устаноў на апошні квартал 1970 года. Гэта, вядома, кропля ў моры для 9 тысяч студэнтаў. Таму прафсаюзным арганізацыям факультэтаў, студэнцкім саветам інтэрнатаў неабходна больш канкрэтна займацца арганізацыяй адпачынку студэнтаў у сценах універсітэта і інтэрнатаў.

**М. ДРОЗД,**
**старшыня прафкома універсітэта.**

# Дзякуем за дапамогу

Сёлета у нашу брыгаду на уборку бульбы прыехалі 43 студэнты-першакурснікі хімічнага факультэта БДУ. Мы пастараліся стварыць ім усе неабходныя умовы для працы. І нашы надзеі апраудаліся. Нам, калгаснікам, вельмі прыемна працаваць побач з гэтымі дружнымі юнакамі і дзяўчатамі. Яны — добры прыклад для нашай моладзі не толькі у працы, але і у паводзінах. У поле студэнты выходзяць рана, а вяртаюцца адтуль, калі пачынае цямнець. І не выпадкова, што кожны з іх накопвае штодзённа па 700—800 кілаграмаў бульбы, значна перавышаючы норму. За шэсць дзён яны сабралі ураджай са 150 гектарау! Гэта вельмі адчувальная дапамога нашай гаспадарцы. Ад імя калгаснікау хочацца ім шчыра падзякаваць.

**Б. ЛІПНІЦКІ,**
брыгадзір брыгады № 1
калгаса «Камінтэрн».



## *Да 50-годдзя універсітэта*

# У ГАРНІЛЕ ЖЫЦЦЯ

## З ГІСТОРЫІ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА

Камсамольская ячэйка БДУ разам з прафсаюзам аказала істотную дапамогу прафесарска - выкладчыцкаму калектыву універсітэта у арганізацыі навуковаэкспедыцыйнай работы сярод студэнтау. Яна праходзіла пры актыуным удзеле студэнцкага навуковага таварыства, якое афармілася яшчэ у 1926-27 навучальным годзе як краязнаучае навуковае таварыства. Яно складалася у асноуным з гісторыка - археалагічнай, культурна - бытавой і батанічнай секцый.

Адна са студэнцкіх экспедыцый вывучала Сухумскую дарогу, другая пазнаёмілася з музеямі Ленінграда, іх беларускімі калекцыямі, трэцяя зрабіла падарожжа па Усходняй Беларусі, выяуляючы і апісваючы помнікі старыны. Краязнаучае таварыства правяло цікавую работу у падшэфным Падгайскім сельсавеце: вывучала спосабы павышэння ураджайнасці сельскагаспадарчых культур, перспектывы эканамічнага развіцця, культурна-гістарычныя помнікі, даследавала флору і фауну, карысныя выкапні на тэрыторыі сельсавета.

У наступныя гады пад кірауніцтвам прафесара А. Р. Радзюшына была арганізавана экспедыцыя на раку Пціч, пасля на Мурманскую біялагічную станцыю. Сабраныя у экспедыцыях калекцыі папоунілі заалагічны музей універсітэта.

Краязнаучым таварыствам праводзіліся таксама археалагічныя даследаванні у Асіповіцкім і Свіслацкім раёнах Бабруйскай акругі уздоуж берагоу ракі Свіслач.

З другой паловы 30-х гадоу навуковая работа студэнтау праходзіць у гуртках, колькасць якіх павялічылася. Найбольш актыуна працавалі гурткі неарганічнай хіміі, тэарэтычнай фізікі, матэматычны, гісторыі СССР. Гэтыя гурткі праводзілі конкурсы на лепшую студэнцкую работу. На навуковай канферэнцыі універсітэта у 1938 г. студэнтамі было прачытана 14 дакладау. Лепшыя з іх публікаваліся у друку. У 1940 г. у дзесяці навукова-даследчых гуртках займаліся 163 студэнты.

Тэматыка навуковых работ усё больш адпавядала інтарэсам і запатрабаванням народнай гаспадаркі і культуры Беларусі. Гэта сувязь з жыццём пашырылася у канцы 30-х гадоу, калі ЦК ВЛКСМ заклікау камсамол рашуча павярнуцца тварам да школы, а новыя палажэнні ва універсітэцкім статуце, абавязаушыя прафесарска-выкладчыцкі калектыу рыхтаваць са студэнтау настаунікау для сярэдняй школы, прымусілі камсамольскую і прафсаюзную арганізацыі БДУ падумаць аб шляхах збліжэння са школай[1]. Студэнты-актывісты правялі матэматычную алімпіяду сярод школьнікау, а пасля арганізавалі матэматычныя гурткі у радзе школ г. Мінска, яны узялі шэфства над адстаючымі вучнямі і г. д.

Грамадскія арганізацыі па-ранейшаму удзялялі вялікую увагу культурна-асветніцкай рабоце сярод студэнцтва. Выключную зацікауленасць у моладзі выклікала дзейнасць камсамола Германіі. Іменна яму быу прысвечаны вечар нямецкай мовы, які адбыуся 9 сакавіка 1936 г. на гістарычным факультэце і набыу агульнауніверсітэцкае значэнне.

Пад кірауніцтвам камітэта камсамола універсітэта быу падрыхтаваны і праведзены вечар у памяць аб 10-годдзі з дня смерці Уладзіміра Маякоускага. У гэтыя ж дні выйшау першы нумар літаратурна-крытычнага часопіса «Першыя крокі».

Вялікім аутарытэтам карысталіся гурткі мастацкай самадзейнасці. У 1938 г. працавала 7 гурткоу. Паспяхова выступау хор гістарычнага факультэта. Універсітэцкі гурток паставіу п'есу Астроускага «Беднасць — не парок».

Крыніцай біла грамадска-палітычнае жыццё універсітэта. Шырокі размах набыла антырэлігійная агітацыя: не было ні адной камсамольскай ячэйкі, якая не праводзіла б вечароу на атэістычную тэму, лятучых масавых мітынгау, карнавальных шэсцяу. Выконваючы заданне Наркамата асветы і ЦС таварыства «Далоу непісьменнасць», камсамольцы прынялі актыуны удзел у ліквідацыі непісьменнасці і здзяйсненні калектывізацыі у родных сёлах. Больш 50-ці студэнтау БДУ праводзілі заняткі у палітгуртках, на падрыхтоучых курсах для паступаючых у вну, у гуртках па ліквідацыі непісьменнасці на падшэфным заводзе «Бальшавік», у школе камсаставу РККА і у 7-й кавалерыйскай дывізіі. Многія з іх удзельнічалі у рэйдах «лёгкай кавалерыі» супраць бюракратызму, безгаспадарчасці і антысанітарыі.

З вялікім уздымам удзельнічала моладзь у падрыхтоуцы і правядзенні першых выбарау у Вярхоуны Савет СССР, Вярхоуныя Саветы саюзных рэспублік і мясцовыя Саветы дэпутатау працоуных. Камсамольцы дапамагалі у афармленні выбарчых участкау, давалі канцэрты мастацкай самадзейнасці, запрашалі выбаршчыкау на сходы і г. д. Спецыяльная камсамольская агітбрыгада выязджала у Пухавіцкі раён для аказання дапамогі мясцовым органам у падрыхтоуцы і выбарах у Вярхоуны Савет БССР.

Камсамольцы універсітэта жыва адклікаліся на важнейшыя падзеі міжнароднага жыцця. У адказ на прыгавор львоускага суда аб расстрэле камсамольцау Гарыя, Югенд і Пропер студэнты выказалі свае гнеуное абурэнне дзеяннямі польскіх фашыстау і запісалі у рэзалюцыі адбыушагася мітынгу: «Заслухаушы інфармацыю аб львоускім прыгаворы над лепшымі камсамольцамі, агульны сход членау ЛКСМБ выказвае сваё абурэнне нечуваным звярыным тэрорам фашыстау і львоускім прыгаворам. Мы патрабуем адмяніць прыгавор смерці... Далоу фашысцкіх палачоу! Няхай жывуць маладыя вязні капіталу!»

У 1936 г. камсамольцы і студэнты універсітэта выступілі у абарону свяшчэннай вайны іспанскага народа за свабоду. Яны звярнуліся да студэнтау Мадрыдскага універсітэта з пісьмом, у якім заклікалі моладзь стойка трымацца у барацьбе з фашызмам. У фонд брацкай дапамогі іспанскаму народу студэнты БДУ сабралі 300 рублёу.

У гады, якія папярэднічалі Вялікай Айчыннай вайне, наша краіна, улічваючы небяспеку знешняга нападзення, дзейна рыхтавалася да абароны. Партыя і урад заклікалі увесь народ узмацніць пільнасць, авалодаць ваеннай справай без адрыву ад вытворчасці. Камсамольская арганізацыя універсітэта пачала праводзіць вялікую работу па прыцягненню камсамольцау і студэнтау у спартыуныя і ваенныя гурткі. Абаронная работа ва універсітэце набыла масавы характар. Група студэнтау БДУ паспяхова авалодвала лётнай справай. Толькі на гістарычным факультэце у 1938 г. 40 чалавек займалася у моташколе, 27 рыхтаваліся да здачы норм на значок «Варашылаускі стралок», 13 вывучалі кулямёт.

Свае дасягненні у абаронна-спартыунай рабоце грамадскасць універсітэта прадэманстравала на святкаванні Міжнароднага юнацкага дня у верасні 1939 г. Калону БДУ узначалілі 300 парашутыстау, 100 снайперау і 41 кавалерыст. У гэтым жа годзе 75 студэнтау-камсамольцау падалі заявы аб прыёме у ваенныя вучылішчы.

**В. СІДАРЦОУ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

*(Працяг будзе).*

*Працяг. Пачатак у №№ 12, 18.*

[1] Па тыпавым статуце 1934 г. пераважная большасць закончыушых універсітэты накіроувалася працягваць вучобу у аспірантуры. Новы статут быу уведзены у 1940-41 г.

# ПРАПАНОЎВАЕ БІБЛІЯТЭКА

*ЗА ЛЕТНІ ПЕРЫЯД УНІВЕРСІТЭЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА ПАПОЎНІЛАСЯ ШМАТЛІКІМІ НАВІНКАМІ. СЕННЯ З ІМІ ЗНАЁМІЦЬ СТ. БІБЛІЯТЭКАР Л. І. ЗРУБОВІЧ.*

### *ЛЕНІНІЯНА*

**Ленин и современная наука. (Сборник статей). В 2-х кн. Кн. 1—2. М., «Наука», 1970.**

**В. И. Ленин и история классов и политических партий в России. М., «Мысль», 1970.**

**Ленинизм и философские проблемы современности. М., «Мысль», 1970.**

**Вобраз У. І. Леніна у беларускім мастацтве. Мінск, «Навука і тэхніка», 1970.**

**Ленин в советской поэзии. Сборник. Л., «Сов. писатель», 1970.**

### *ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА*

**Брежнев, Л. И. Ленинским курсом. Речи и статьи. Т. 1—2. М., Политиздат, 1970.**

**Против буржуазных фальсификаторов истории КПСС. Сборник статей. М., Политиздат, 1970.**

**Критика буржуазной политической экономии. (Сборник статей). Под ред. проф. Ф. Я. Полянского. М., Изд. МГУ, 1970.**

**Василев, С. Теория отражения и художественное творчество. Пер. с болг. М., «Прогресс», 1970.**

**Психология. Учебное пособие. Под ред. А. А. Зарудной. Минск, «Высшая школа», 1970.**

### *ЦІКАВА ДЛЯ ГІСТОРЫКАЎ*

**Источниковедение истории СССР. XIX — нач. XX в. Учебное пособие. М., Изд. МГУ, 1970.**

**Люблинская, А. Д. Латинская палеография. Учебное пособие. М., «Высшая школа», 1970.**

**Великая Отечественная. Краткий очерк истории Великой Отечественной войны Советского Союза 1941—1945 гг. М., Политиздат, 1970.**

**Очерки русской культуры XIII—XV вв. Ч. 1—2. М., «Наука», 1970.**

### *БІЕЛАГАЎ*

**Хржановский, В. Г. Основы ботаники с практикумом. Учебник. М., «Высшая школа», 1970.**

**Материалы III съезда Белорусского физиологического общества им. И. П. Павлова. Минск, «Наука и техника», 1970.**

**Гилмур, Д. Метаболизм насекомых. М., «Мир», 1970.**

### *ГЕОГРАФАЎ*

**Хрущев, А. Т. География промышленности СССР. М., «Мысль», 1970.**

**Григорьев, А. А. Типы географической среды. М., «Мысль», 1970.**

**Победина, М. П. Экономическая география стран Ближнего и Среднего Востока. Пособие для учителей. М., «Просвещение», 1970.**

**Шабо, Ж. Франция. Развитие экономико-географических районов. М., «Прогресс», 1970.**

### *МАТЭМАТЫКАЎ*

**Сборник задач и упражнений по дифференциальной геометрии. (Учебное пособие для математических специальностей университетов и пединститутов). Минск, «Высшая школа», 1970. Авторы: Воднев, В. Т., Гусак, А. А., Нахимовская, А. Н., Рябушко, А. П., Тутаев, Л. К. и Феденко, А. С.**

**Крыньский Х. Математика для экономистов. Пер. с польского. М., «Статистика», 1970.**

**Смирнов, М. М. Уравнения смешанного типа. М., «Наука», 1970.**

**Арфкен, Г. Математические методы в физике. Перевод с английского. М., Атомиздат, 1970.**

**Шварц, Дж. Дифференциальная геометрия и топология. М., «Мир», 1970.**

### *ФІЗІКАЎ*

**Ольховский, И. И. Курс теоретической механики для физиков. Учебное пособие. М., «Наука», 1970.**

**Медведев, С. А. Введение в технологию полупроводниковых приборов. Учебное пособие. М., «Высшая школа», 1970.**

**Прикладная инфракрасная спектроскопия. Под ред. Д. Кендалла. М., «Мир», 1970.**

**Бор, Нильс. Избранные научные труды. В 2-х т. М., «Наука», 1970.**

### *ФІЛОЛАГАЎ І ЖУРНАЛІСТАЎ*

**Гуляев, Н. А. и др. Теория литературы в связи с проблемами эстетики. (Учебное пособие для студентов фил. факультетов). М., «Высшая школа», 1970.**

**Общее языкознание. Формы существования, функции, история языка. Под ред. Б. А. Серебренникова. М., «Наука», 1970.**

**Солганик, Г. Я. Стиль репортажа. М., Изд. МГУ, 1970.**

### *ХІМІКАЎ*

**Киселева, Е. В. и др. Сборник примеров и задач по физической химии. Учебное пособие. М., «Высшая школа», 1970.**

**Банн, Ч. Кристаллы, их роль в природе и науке. Пер. с англ. М., «Мир», 1970.**

**Дятлова, Н. М. Комплексоны. М., «Химия», 1970.**

# ЛЕТНІЯ КАНФЕРЭНЦЫІ

Цікава прайшлі у час летніх канікул канферэнцыі чытачоу, прысвечаныя XXIV з'езду КПСС і 50-годдзю ЛКСМ Беларусі. Яны былі арганізаваны выкладчыкамі ваеннай кафедры, супрацоунікамі бібліятэкі і камітэтам камсамола універсітэта для студэнтау чацвёртых курсау прыродазнаучых і гуманітарных факультэтау. На адной з іх гутарка ішла аб подзвігах камсамольцау на франтах Вялікай Айчыннай вайны, аб іх высакародных чалавечых характарах, адданасці Радзіме, народу. Другая прайшла пад назван «Беларусь — край партызанскі». Перад студэнтамі выступіу Герой Савецкага Саюза генерал-маёр у адстауцы А. В. Кірсанау. Актыуна удзельнічалі у канферэнцыях студэнты А. Козуб, Ю. Шынкар, Г. Бараукоу, А. Корхау, А. Абуховіч, А. Бутэвіч і іншыя.

**(Наш кар.).**

# ВОСТРАЙ ЗБРОЯЙ

Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна выпусціла у свет кнігу кандыдата філалагічных навук, пісьменніка П. І. Ткачова «Вечны бой»[1]. У падзагалоўку яе значыцца: «Памфлетная спадчына Я. Галана і традыцыі М. Горкага». У даследаванні, якое складаецца з трох частак, аутар робіць паспяховую, на наш погляд, спробу «правесці аналіз усёй памфлетнай спадчыны выдатнага украінскага публіцыста у святле непераходзячых горкаускіх традыцый; прасачыць станауленне памфлета у творчасці Я. Галана, паказаць дзейснасць і значэнне яго творау, накіраваных на выкрыццё фашызму, клерыкалізму, нацыяналізму; прыадчыніць дзверы у творчую лабараторыю Я. Галана - памфлетыста». П. Ткачоу разглядае і шырока вядомыя творы публіцыста, і тыя, якія па той ці іншай прычыне не былі апублікаваны і захоуваюцца у архівах і рукапісных фондах УССР. Аўтар кнігі даследуе таксама асобныя памфлеты і іх варыянты, рэцэнзіі і запісныя кніжкі Я. Галана, яго перапіску з роднымі і знаёмымі.

У першай частцы П. Ткачоу дае падрабязную характарыстыку так званаму «вікнаускаму» перыяду—аднаму з плённых у творчасці пісьменніка да 1939 года. Іменна у перыяд работы у часопісе «Вікна» Я. Галан упершыню пачау карыстацца у барацьбе з рэакцыяй зброяй вялікай знішчальнай сілы—памфлетам. У 1929—32 гг. ён стварыу цэлы рад памфлетау-рэцэнзій, у якіх аналізавау буржуазна-нацыяналістычныя выданні. Памфлетам-рэцэнзіяй умела карысталіся яшчэ В. Бялінскі, М. Чарнышэускі, М. Дабралюбау, а пазней — М. Горкі. Іменна горкаускі прыём «нападзення» бліскуча выкарыстау Я. Галан пры стварэнні цэлага раду творау. Сярод іх найбольш значным з'яуляецца нарыс-памфлет «Львоу напярэдадні», у якім Я. Галан звяртаецца да вобраза буры. Як Горкі у пачатку XX стагоддзя адчувау набліжэнне рэвалюцыйнай буры у Расіі і клікау яе, так і Галан у пачатку 30-х гадоу прадказвау непазбежнасць яе прыходу на зямлю Заходняй Украіны. Вобраз буры, зазначае далей П. Ткачоу, ёсць і у некаторых іншых творах Я. Галана, у прыватнасці у апавяданні «На мосце» і у нарысе «Перад навальніцай». У памфлеце «Львоу напярэдадні» Я. Галан звяртаецца таксама да вобразау хвалі і грому, якія выкарыстоувау і Горкі. Аутар даследавання ставіць пытанне: ці апрауданы зварот Я. Галана да гэтых вобразау? — і сам жа адказвае: так, апрауданы. Рабочыя, сяляне і прагрэсіуная інтэлігенцыя Заходняй Украіны і Польшчы ведалі творы Горкага. Дастаткова было некалькі фраз, каб чытач зразумеу, аб чым ідзе гутарка.

Заканчваючы аналіз галанаускіх памфлетау «вікнаускага» перыяду, П. Ткачоу прыходзіць да вываду, што у гэтых творах яшчэ няма той глыбіні гістарычнасці у выкрыцці каталіцызму, нацыяналізму і фашызму, якая уласціва памфлетам Я. Галана савецкага перыяду. І усё ж выступленні публіцыста мелі велізарны поспех і прыносілі шмат непрыемнасцей афіцыйнай уладзе.

У другой частцы — «У барацьбе з рэакцыяй» — П. Ткачоу паказвае дзейнасць Я. Галана у гады Вялікай Айчыннай вайны, ацэньвае яго працу у якасці каментатара радыёстанцыі імя Шаўчэнкі, а затым «Дніпро» і «Радзянська Україна». У гэты перыяд Я. Галан стварыу цэлы шэраг творау, у якіх кляйміу гітлераускіх прэтэндэнтау на сусветнае панаванне, выкрывау іх злачынствы, заклікаў працоуных да барацьбы з фашысцкімі захопнікамі. Адно з цэнтральных месц у антыфашысцкай публіцыстыцы Я. Галана ваенных гадоу займала тэма усенароднай барацьбы супраць гітлерызму. З ёй цесна звязана і тэма вызваленчага руху народау Еўропы супраць фашысцкага іга. Але творчасць Я. Галана гэтых гадоу не была пранізана сляпой нянавісцю да усяго нямецкага народа. Пісьменнік-інтэрнацыяналіст добра разумеу, што фашызм і нямецкі народ—паняцці розныя. Гэту адну з характэрнейшых рыс галанаускай публіцыстыкі ваенных гадоу, якая зближае яе з глыбока гуманістычнай публіцыстыкай М. Горкага, неаднаразова падкрэслівае П. Ткачоу.

Немалое месца у кнізе адводзіцца даследаванню памфлетнай дзейнасці украінскага публіцыста супраць рэлігіі і яе носьбітау—«святых айцоу». Антырэлігійныя творы Я. Галана аутар даследавання умоуна падзяляе на два віды: так званыя антыуніяцкія і антыпапскія памфлеты. П. Ткачоу паслядоуна раскрывае чытачу гісторыю стварэння некаторых з іх, прыводзіць вытрымкі з асобных памфлетау, якія сведчаць аб вялікай і карпатлівай працы публіцыста над пытаннямі каталіцызму. У кнізе прыводзяцца факты таго велізарнага палітычнага значэння, якое набывалі антыуніяцкія памфлеты Я. Галана. Яго антыпапскія памфлеты працягвалі тую ж лінію, бязлітасна выкрывалі Ватыкан і яго злачыннага натхняльніка — папу. Гнеунае слова публіцыста спалучалася з глыбокім веданнем гісторыі. Памфлеты Я. Галана, падкрэслівае П. Ткачоу, іменна гістарычна паказвалі каталіцызм як зленшага ворага працоуных і навукова даказвалі непазбежнасць яго гібелі. Гістарызм у Я. Галана спалучауся з вялікім мастацкім майстэрствам. Факты пададзены ярка, завострана, лёгка запамінаюцца.

Некалькі раздзелау другой часткі даследавання аутар адводзіць аналізу так званых антынацыяналістычных памфлетау Я. Галана.

У апошняй частцы даследавання — «У творчай лабараторыі Я. Галана-памфлетыста»—П. Ткачоу аналізуе, акрамя нататкау публіцыста «Мая работа у Нюрнбергу», яго рукапісы, запісныя кніжкі, пісьмы, а таксама успаміны і сведчанні родных і блізкіх. П. Ткачоу паказвае пошукі Я. Галанам формы падачы матэрыялу, пошукі трапных слоу, параунанняу, эпітэтау, метафар. Умелае выкарыстанне выяуленчых сродкау украінскі публіцыст ставіу вышэй за усё і лічыу гэта вялікім майстэрствам. П. Ткачоў адзначае таксама лексічную разнастайнасць галанаускай мовы, прыводзіць у доказ гэтага шматлікія прыклады.

Новае даследаванне прынясе несумненную карысць філолагам, журналістам, а таксама прыхільнікам творчасці Я. Галана.

**В. ШЫХАНЦОЎ,**
студэнт журфака.

[1] **Ткачев П. И.** Вечный бой. Минск. Изд. БГУ. 1970.

## ПОСПЕХ НАШАГА ШАШЫСТА

У эстонскім горадзе Тарту фінішавау пауфінал 30-га першынства СССР па рускіх шашках сярод мужчын. У выніку упартай барацьбы першае месца заняу прадстаунік нашай рэспублікі студэнт БДУ імя У. І. Леніна Уладзімір Беляеускі. Ён атрымау права удзельнічаць у фінале першынства СССР, якое адбудзецца ў канцы кастрычніка у Ліепаі (Латвійская ССР).

**А. БАРЫСАЎ.**

## Між намі
## Клуб гумарыстаў

- **Больш за усё памылак знаходзяць тыя, што чытаюць па складах.**
- **Рабіць муху са слана нерэнтабельна: вельмі многа адходау.**
- **Што з таго, што у мышы выраслі крылы? Усё роуна яе называюць лятучай, а не крылатай.**
- **Аутарытэты часам вельмі падобныя на звычайныя гумавыя шары. Спачатку іх надзімаюць, а пасля яны з трэскам лопаюцца.**
- **Людзі часцей топяцца, калі мора ім бывае па калена.**
- **Воука у аучарню таксама можна пускаць без усякай рызыкі, калі, да прыкладу, у аўчарні няма авечак...**
- **Ісціну заусёды адмаўляюць гучна, а прызнаюць ціха.**
- **Цесныя сувязі шырока расчыняюць дзверы.**
- **Бессардэчны заусёды спасылаецца на сэрца.**
- **Любіу самакрытыку: усіх крытыкавау сам.**
- **У кахання няма дарожных знакау, таму на яго дарогах шмат катастроф.**
- **Ён быу пятым колам у калясніцы, але інструкцыі не дазвалялі выязджаць без запаснога кола.**

# МАЕ ДАПАЎНЕННІ

Нядауна адзін часопіс прапанавау пачаць больш рашучую барацьбу з курэннем. «Трэба,—гаворыцца у часопісе,—на кожнай пачцы папярос або сігарэт напісаць выразна і ясна, якую шкоду яны прыносяць. Няхай курэц дрыжыць ад страху, прачытаушы, што ён купіу і што абяцае яму гэта пакупка». Прапанова, зразумела, выклікала дыскусію: некурцы аднесліся да яе спачувальна, курцы—скептычна, сёй-той з ліку працаунікоу гандлю выказау нават сваё незадавальненне.

Асабіста мне гэта прапанова спадабалася. Пара, дауно пара растлумачыць людзям, колькі бед нясе у сабе кожная папяроса, кожнае воблака тытунёвага дыму! У мяне нават узніклі пэуныя дапауненні да гэтай прапановы. Перш за усё, ніякіх яркіх малюнкау на тытунёвых упакоуках! Усё чорнага колеру, з белым чэрапам у самым цэнтры. Эскіз можна запазычыць у бліжэйшай трансфарматарнай будкі. Дыялог пакупніка з прадауцом тытунёвых вырабау павінен гучаць прыкладна так:

— Добры дзень! Калі ласка, пачку «Беламора».

— Няма у нас, дарагі сябар, ніякага «Беламору». Вось, калі ласка, папяросы «Парок сэрца», сігарэты «Астма» ці «Гіпертанія», тытунь «Бывай, сям'я».

— Выбачайце, а гэта... «Гіпертанія» у вас як, моцная?

— Калі патрэбны моцныя, пад канец дня прыходзьце. Нам абяцалі прывезці дзве скрыні «Заваловых»... Вельмі моцныя сігарэты... З гарантыяй...

— Не! Не! «Заваловых» мне не трэба... У мяне яшчэ дзеці маленькія... Я, бадай, з «Гіпертаніі» пачну...

Дрыжачымі рукамі бярэ пакупнік сігарэты і, нізка схіліушы галаву, выходзіць з крамы...

Эфектыуна? Думаю, што так!

А ці ж віна-водачныя вырабы не заслугоуваюць такой жа рэформы?

Каму патрэбны гэтыя прывабныя наклейкі на бутэльках і звонкія назвы? Хай гэта будзе, скажам, сухая або паусухая «Мігрэнь», каньяк «Прыпадачны», гарэлка «Белая гарачка»... А як вы думаеце, сябры?

**М. БАГУСЛАЎСКІ.**

# ВЯСЁЛЫ КАЛЕЙДАСКОП

*Настауніца звяртаецца да вучня:*

*— Хацела б я праз тыдзень быць тваёй маці. Змяніуся б ты тады зусім!*

*— Добра, пагавару з татам, можа згодзіцца.*



*Сучасны Дыяген.*

* * *

*На цёмнай вуліцы сустракаюцца двое. Адзін з іх пытаецца:*

*— Скажы, браце, ты не бачыу паблізу міліцыянера?*

*— Не, не бачыу.*

*— Ну, тады здымай гадзіннік.*

* * *

*— Мая слабасць — гэта акварыум. Я магу сядзець каля яго гадзінамі.*

*— А як адносіцца да гэтага ваша жонка?*

*— Жонка? А якая ёй справа да таго, што я раблю на рабоце.*

* * *

*— Тата, чаму старажытныя грэкі заусёды малявалі перамогу ў жаночым вобліку?*

*— Даведаешся, сынок, калі ажэнішся.*

* * *

*— Міша пытаецца у брата:*

*— Коля, ты не ведаеш, дзе Альпы?*

*— Спытайся ў мамы. Гэта яна заусёды усё хавае.*

* * *



*Без слоу.*



*Самакрытыка.*

* * *

*Два прыяцелі сустракаюцца пасля даволі працяглай разлукі.*

*— А як там тваё мінулае вялікае каханне?*

*— Скончылася.*

*— Вы рассталіся?*

*— Не, ажаніліся.*

* * *

*Пажылая жанчына упершыню ляціць на верталёце. Пасля узлёту яна гаворыць пілоту:*

*— Сынок, тут так дус, выключы, калі ласка, гэты вентылятар наверсе.*

* * *

*Выпадковы назіральнік звяртаецца да рыбалова-аматара:*

*— Як справы?*

*— Нядрэнна.*

*— Што злавілі?*

*— Сёння нічога.*

*— І гэта называецца нядрэнна?*

*— Вядома. Майму суседу другі дзень нічога не пападаецца.*

## ГАЛАВАЛОМКІ



Дзесяць манет пакладзены у трохвугольнік вяршыняй уверх. Якім чынам размясціць гэты трохвугольнік вяршыняй уніз, калі пры гэтым дазваляецца перасунуць толькі тры манеты?

* * *

Знайдзіце такі лік, які павялічыцца удвая пры перастаноуцы апошняй лічбы на першае месца.

### ПАПРАЎКА

У мінулым нумары газеты у артыкуле «У дарогу паклікала дружба» дапушчана памылка. Усесаюзны інтэрнацыянальны аутапоезд узначальвау супрацоунік нашага універсітэта Ц. В. Старчанка.

## ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ!

**Жадаючыя пасяліцца на прыватных кватэрах могуць набыць адрасы у прафкоме універсітэта (гал. корпус, п. 205).**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 1152. АТ 21798